**100.** Прачытайце верш. З дапамогай якіх дзеясловаў паэт вобразна апісвае дождж?

Знайдзіце ў вершы словы, у якіх: а) прыстаўная галосная пішацца перад збегам зычных; б) прыстаўная галосная не пішацца перад збегам зычных. Растлумачце іх правапіс.

### Кропля

Дождж прарваўся з ветрам
У спякоту,
Па пясках ударыў
Буйным шротам*.
За адно імгненне,
За хвіліну
Перамыў лістоту[м] на галінах,
Пачапіў на кожнае іглінцы
Па адной засмучанай слязінцы.
Прашумеў. Суняўся.
Ціха стала.
І слязінка кожная зайграла.
Колькі ў кроплю
Фарбаўназаткана,
Быццам свет увесь у ёй сабраны:
Поле, луг,
Сады ўсяго пасёлка,
І рака, і неба,
І вясёлка!

*П. Броўка.*

Напішыце міні-сачыненне (4-5 сказаў) на тэму «Колькі ў кроплю фарбаў назаткана!». Словы якіх часцін мовы будуць адыгрываць у гэтым тэксце галоўную тэкстаўтваральную ролю?

**ІМЖЭЦЬ — ІМШЭЦЬ**

**Імжэ́ць** — ісці, падаць, асядаць дробнымі кропелькамі (пра дождж): *на вуліцы імжэла.*

**Імшэ́ць** — зарастаць мохам: *балота імшэе.*

**101.** Спішыце сказы, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары. Растлумачце правапіс прыстаўных галосных.

1. Пасля дажджоў прырэчнае балота шырока разлілося, заліло ..мшарыну, якая, бы цеста на дражджах, пачала пухнуць мяккім вільготным мохам *(В. Быкаў)*. 2. Халодны пот выступіў на ..лбе *(Я. Колас)*. 3. І вось сёння за акном ..мжыў дождж[ф], які не радаваў гарадскую госцю, але вельмі цешыў вяскоўцаў, бо не трэба будзе паліваць агародніну *(М. Кукуць)*. 4. Пот ручаямі сцякаў з ..лба, шыі, і Іван разпораз выціраў яго прамоклай хусцінкай *(С. Сяргей)*. 5. Грудзі ..рваў сухі кашаль *(А. Мальдзіс)*. 6. Цяпер ніхто не забараняе касіць ..ржышча і ніхто і не косіць яго *(А. Жук)*. 7. Яму і сапраўды захацелася гэтай гарачай бульбы з ..льняною тоўчанкай, з кіслым малаком *(В. Казько)*.

- Складзіце схемы 1-га і 3-га сказаў.



Правообладатель Национальный институт образования

**102.** Знайдзіце ў сказах фразеалагізмы, растлумачце наяўнасць або адсутнасць прыстаўных галосных.

1. З раніцы да позняй ночы брыгада ..рве жылы, да знямогі высільваецца *(М. Капыловіч)*. 2. А я ж ..рвала глотку на ўвесь бор! Дзе ты прападаў? *(З. Бядуля)*. 3. Каб не ..рваць сабе душу, ён ледзь не бегма падаўся адсюль *(І. Кудраўцаў)*. 4. У млыне Крушынскі ніводнай хвіліны на месцы не можа ўстаяць. Яго ..рвуць на кавалкі — то туды, то сюды *(З. Бядуля)*. 5. Цяпер госці ўсе былі на зборнай і ..рвалі жываты ад смеху *(Я. Колас)*.

Запішыце фразеалагізмы ў адпаведнасці з прыведзенымі значэннямі: ‘бесперапынна турбаваць просьбамі, даручэннямі’; ‘вельмі моцна гаварыць, крычаць, спяваць’; ‘цяжка, з вялікім напружаннем працаваць, надрывацца на рабоце’; ‘вельмі моцна і доўга, да знямогі смяяцца’; ‘моцна трывожыцца, хвалявацца, мучыцца’.

**103.** Складзіце з прапанаванымі парамі слоў сказы так, каб у адным выпадку была прыстаўная галосная, у другім — не было. Запішыце.

Ілгаць — лгаць, ільняны — льняны, ірвануцца — рвануцца.



Правообладатель Национальный институт образования